# *Аркадзь Куляшоў і яго творчасць*



# «ПАМЯЦЬ ТВАЯ НЕ САТРЭЦЦА...»

*Ёсць на свеце роднае мястэчка,*
*Там штогод бываюць кірмашы;*
*Міма школы меленькая рэчка*
*Без мяне адна плыве ў цішы...*
*(А. Куляшоў. “Карусель”)*

**Нарадзіўся Аркадзь Куляшоў 6 лютага 1914 года на Магілёўшчыне ў мястэчку Саматэвічы Касцюковіцкага раёна.**

**Край магілёўскі!**
**З гармат Еўропы**
**Смерць засявала**
**твой шнур жалезам**
**Ды**
**не змагла — заraслі акопы,**
**А не дарогі, травой і лесам...**



# *Маці і бацька паэта: Кацярына Фамінічна Ратабыльская і Аляксандр Мікалаевіч Куляшоў*



# *Пачатак літаратурнай дзейнасці*

- *Цікавіцца вершамі і спрабаваць пісаць іх сам Аркадзь Куляшоў пачаў з сямі год, а ў 1926 годзе ў клімавецкай газеце "Наш працаўнік" быў надрукаваны яго першы верш "Ты, мой брат" на беларускай мове пад псеўданімам Аркадзь  Дуда". Праз год газета "Магілеўскі селянін" змяшчае каля дзясятка яго вершаў, а адзін трапляе ў газету "Беларуская веска".*

# *Пачатак літаратурнай дзейнасці*



*Пасля таго, як разведзеныя бацькі Аркадзя Куляшова, вясковыя настаўнікі, раз‘ехаліся па розных школах, ён, вучань сямігодкі, застаўся ў роднай хаце працягваць навучанне. У хуткім часе хата ператварылася ў інтэрнат, пад яе дахам зажылі дружнай камунай восем хлопцаў і адна дзяўчына пад наглядам беспрытульнай цёткі Тадораўны, якая таксама знайшла тут свой прытулак.*

# *Пачатак літаратурнай дзейнасці*

*Саша, Алеся – сапраўднае прозвішча – Карыт-кіна. Гэта яна запаліла ў душы юнага паэта першыя нясмелыя іскрынкі кахання, а развітанне з ею – да стварэння верша “Бывай...” (1978). Сёння – шэдэўр беларускай лірыкі. Пакладзены на музыку І. Лучан-ком, выконваюць “Песняры”. Беларуская песня “Але-ся” перакладзена на рускую (А. Дзербянёвым) і ўк-раінскую (А. Орачам) мовы.*

Бывай, абуджаная сэрцам дарагая,
Чаму так горка, не магу я зразумець,
Шкада заранкі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.

# *Гады навучання*





*У 1928 годзе А. Куляшоў паступае ў Мсціслаўскі педтэхнікум, дзе пасябраваў з Юліем Таўбіным і Змітруком Астапенкам.*

# Гады навучання



З 1931г. па 1933г. вучыцца на літаратурным факультэце Мінскага педінстытута. Паяўляецца шмат вершаў, пад кожным дата: 17·VII, 25·VII, 27·VII. Лета. Канікулы.

# *Гады навучання*



***А. Куляшоў з жонкай
і Аляксеем Зарыцкім.***

*У 1932 годзе выходзяць адразу два зборнікі паэта:
"Па песню, па сонца!" і
"Медзі дождж"*



*Сям'я А. Куляшова: жонка, дзеці Валянціна, Уладзімір, Аляксандр, Аўгіння Бараноўская*

- *1932-1935 гады – час упартай працы Аркадзя Куляшова над вялікай эпічнай формай.*
- *У 1933 годзе – паэма "Аманал"*

# Сяброўства з А.Твардоўскім

- Творчы чалавек не можа стаяць на месцы:ён павінен быць заўсёды ў цэнтры падзей. Вось як сам пісьменнік гаварыў: “Сачу за ўсім, што з’яўляецца новага ў нашай паэзіі. З надзеяй і трывогай гартаю нумары тоўстых часопісаў, шукаю адказы на пытанні, якія хвалююць мяне. Нарэшце. Як адкрыццё. Як прасвятленне – “Краіна Муравія” Аляксандра Твардоўскага.
- Я нікольві не перабольшу, калі скажу, што, як паэт, сваім нараджэннем я абавязаны менавіта гэтаму твору”.

# Сяброўства з А.Твардоўскім



Куляшоў падпісвае кнігу Твардоўскаму.

Вайна ягоны век укараціла?..
Хвароба?.. Не!
Не падуладна ім
Любоў да працы прагнай,
што спаліла
Звышчалавечым высілкам
сваім
Яго жыццё, нібы маланка
лес,
Які ў агні самазнішчальным
згінуў.
(урывак з паэмы “Варшаўскі
шлях”)

# *Зборнік “Юнацкі свет”*

*Паэт глядзіць на свет вачыма сваіх маладых герояў. Яны працуюць, дружаць, думаюць пра будучыню. У ранняй творчасці А. Куляшова паўстае чалавек з яго штодзеннымі клопатамі і пачуццямі, светлымі юнацкімі парываннямі. Вершы вызначаюцца поўнай гарманічнай зладжанасцю думак, пачуццяў, настрояў.*

*У вершы “Песня лістаносца” расказваецца пра дзяўчыну, якая з нецярпеннем чакала лістаносца.*

Даспявае маліна
У зялёным садку;
Ходзіць красна дзяўчына
Ды адна па цяньку…

# *Зборнік “Юнацкі свет”*

*Галоўны матыў зборніка "Мы жывем на граніце” – воінская пільнасць ва умовах вайны.*

*Паяўляюцца творы, дзе адчуваецца трывож-ны подых набліжэння грознай ваеннай небяспекі («Стаіць на ўзлессі дом...», «Ранак»):*

Выходжу я ў разведку —
Рашучы заўтра бой.
Ты, ранак,
Будзь за сведку,
Услед ідзі за мной.
У родную краіну
Дарогі перайнач.
А я? А я загіну.
А ты?
А ты не плач.

# “Грош цана паэту, здольнаму на здраду”

- *Увесь 1937 год Куляшова адмаўляліся друкаваць, і сям'я перабівалася з хлеба на ваду.*
- *Аркадзь Куляшоў быў адным з менш чым двух дзесяткаў беларускіх літаратараў, якога мінуў молах сталінскіх рэпрэсій.*

# *“На вайне пра вайну”*

*24 чэрвеня 1941 А. Куляшоў пакінуў разбураны бамбардзіроўкамі, ахоплены пажарам Мінс і накіраваўся на фронт.*

Як ад роднай галінкі
дубовы лісток адарваны,
Родны Мінск я пакінуў,
нямецкай бамбёжкаю гнаны.

# “На вайне пра вайну”



«Песня мая пехацінцам увойдзе ў твой дом», — напісаў ён некалі, і яна сапраўды ўвайшла, глуха стукнулася каскай аб нізкі касяк, пратупала салдацкімі ботамі па вымытай падлозе, ледзь не скінуўшы прыкладам з камоды парцалянавую скарбонку — самае дарагое, што ёсць у доме.

# “На вайне пра вайну”



*А. Куляшоў з супрацоўнікамі армейскай газеты Знамя Советов на Паўночна-Заходнім фронце. 1942г*

# “На вайне пра вайну”

У верасні-кастрычніку 1942 года была напісана паэма «Сцяг брыгады».

У снежні Аркадзь Куляшоў прачытаў яе ў маскоўскай кватэры Аляксандра Твардоўскага, з якім сябраваў. Усіх, хто слухаў паэму, уразіла і здзівіла, як у такіх умовах, працуючы ў армейскай газеце, А. Куляшоў здолеў напісаць такі вялікі твор.

# *“На вайне пра вайну”*

- *Уладзімір Барысавіч Фарберaў, галоўны рэдактар газеты “Знамя Саветаў”, дзе служыў Куляшоў, ставіўся адмоўна да гэтай “звышурочай” працы свайго супрацоўніка, хоць ва ўспамінах піша пра гэта інакш.*

*Вялікага сэнсу ў гэтай працы Уладзімір Барысавіч тады не бачыў —паэма пісалася на беларускай мове і быць надрукаванай у яго газеце не магла, нават калі б аўтара яе і нанаткала творчая ўдача.*

# *“На вайне пра вайну”*

*1942г. Комсомольская правда надрукавала верш“Віцебская махорка”.*

Здан горад Віцебск. З весткай горкай
Ішлі мы ўздоўж яго Дзвіны.
Здан Віцебск.
Мы яго махорку
Яшчэ курылі да вайны.
Наперад мы, на захад рушым
І ўсё, што вораг знішчыў, знёс,
Усё вярнуць назад прымусім,
Ўсе,
Нават дым ад папярос.

# *“На вайне пра вайну”*

*“Над брацкай магілай”. 1942г.*

*Верш-смутак па роднай зямлі, па “хлопцах-беларусах, што чэсна галовы злажылі”.*

Беларусь мая родная,
як жа я рвуся яшчэ раз
Пеша ўсю цябе змераць,
увесь і чабор твой і верас!
Сэрца просіць шляхоў,
Што цяжкім маім ботам пад сілу;
Наглытацца хачу туманоў,
Твайго ветру і пылу;
Наглытацца хачу за сябе і за тых,
Што не ўстануць з нябыту...

# *“На вайне пра вайну”*



*А. Куляшоў і А.Суркоў на Бранскім фронце. 1943г.*

# *“На вайне пра вайну”*

## *“Балада аб чатырох заложніках”*

*У гады Вялікай Айчыннай вайны А. Куляшоў стварыў цэлы баладны цыкл пра подзвіг беларускага народа ў гады ліхалецця, у рамках якога вылучаюцца вершы-балады “Млынар”, “Над брацкай магілай”, “Ліст з палону”, “Маці”, “Балада аб чатырох заложніках”.*

*Фашысты лютавалі, патрабуючы з'яўлення Бацькі Міная (партызанскі псеўданім Шмырова Міная Піліпавіча), аднаго з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Віцебшчы-не, камандзіра партызанскага атрада, а затым і брыгады. Сваю лютасць ворагі вымесцілі на безабаронных дзецях і сястры :*

Цэліць кат
У льняныя галовы,
Пачынае
З сына Міная.
Стрэл.
Упаў хлапчук трохгадовы...

# *Пасляваенныя гады*



- Перыяд першага пасляваеннага дзесяцігоддзя быў самым творча ўскладнёным ў паэзіі А. Куляшова, як і яго паплечнікаў, абпаленых вайной (П. Броўкі, М. Танка, П. Панчанкі). З аднаго боку, у яго паэзіі, свядома зарыентаванай на працоўную адбудову і мірныя далягляды, з'явіліся прыгожыя, моцныя, сапраўды куляшоўскія па прыродзе таленту вершы, балады («Колас», «Вяселле», «Крылы», «Карандаш», «Пасведчанне», «Маё пасведчанне», «Балада пра вока»). З другога — творы, рэгламентаваныя часам.

# Пасляваенныя гады



*А. Куляшоў і Я. Колас пасля атрымання Дзяржаўнай прэ- міі СССР. 1949г.*

*Аркадзь Куляшоў — двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР ("Сцяг брыгады", 1946, "Новае рэчышча", 1949). Дзяржаўная прэмія БССР імя Я. Купалы прысуджана яму ў 1970 годзе за пераклады твораў Міхаіла Лерманта-ва ("Выбраная паэзія", 1969 ), Івана Катлярэўскага ("Энеіда", 1969), Генры Лангфелы ("Спеў аб Гаяваце", 1969). Прэміяй Ленінскага камсамола Беларусі ў 1968 г. адзначаны паэмы: «Толькі ўперад», «Песня аб слаўным паходзе», «Грозная пушча», «Балада аб чатырох залож-ніках», вершы: «Ліст з палону», «Камсамольскі білет», «Камуністы».*

# “І пяройдзе шлях у новы шлях”

- *У 1961 годзе пачалі паяўляцца ў друку лірычныя вершы Куляшова, аб’яднаныя агульнай назвай “З новай кнігі”.*

- *Пазней у 1964 годзе куляшоўскія вершы 1956-1963 гадоў выйшлі ў Маскве асобнай кнігай. У сувязі з іх выхадам А. Твардоўскі адзначыў: “Ён не спыняецца на дасягнутым аднойчы, зноў і зноў з большай альбо з меншай удачай адрываецца ад самога сябе ўчарашняга, каб стаць сённяшнім і заўтрашнім”.*

# *“З новай кнігі”*

*Кожны вершаў зборніка можа служыць доказам*
*таго, што касмічная тэма ў лірыцы*
*паэта і яго светаадчуванні зрабілася ўжо такой*
*важкай, што перавяла*
*само гэтае светаўспрыманне на якасна новую*
*ступень — ступень касмічную. Тэма космасу займала*
*фантазію Куляшова трывала.*

# *“І пяройдзе шлях у новы шлях”*

- *У лірыцы А. Куляшова 60—70-х гг.выявіліся вялікія духоўныя і фізічныя мажлівасці чалавека — прага дзейнасці, адчуванне сваёй асабістай велічы і вартасці, адказнасць за «цяжкую пасаду паэта», за лёс Айчыны, разуменне сутнасці гістарычных падзей і ўсеагульнай сувязі з'яў.*
- *Вершы гэтага перыяду вызначаюцца філасофскім зместам.*

# *“І пяройдзе шлях у новы шлях”*

- *У 60-70-я  А. Куляшоў таксама напісаў шмат твораў пра выдатных сыноў нашага народа. Найбольш значнымі ў гэты час кнігамі былі зборнікі вершаў “Новая кніга”, ” Сасна і бяроза”, а таксама паэмы “Цунамі”, “Далека да акіяна”, “Варшаўскі шлях”. Цыкл вершаў «Маналог », прысвечаны памяці З. Астапенкі і Ю. Таўбіна, беспадстаўна абвінавачаных у гады культу асобы Сталіна. Пра выдатнага кіраўніка нацыянальна – вызваленчага руху ў 1863 г. Кастуся Каліноўскага А. Куляшоў расказаў у драматычнай паэме ”Хамуціус” (1975).*

# *“І пяройдзе шлях у новы шлях”*

Паэма «Хамуціус»

*Першапачатковая рабочая назва паэмы была «Кастусь Каліноўскі». Сабраўшы матэрыял, паглыбіўшы тэму, бацька вырашыў даць ёй другую назву, выкарыстоўваючы ў ёй не прозвішча героя, а адну з яго падпольных мянушак. «Хамуціус» — гэта «хам», але на манер адукаваных, бо знаёмых з латынню людзей. Чаму «хам»? Таму, што так ганебна называлі ў той час беларускага мужыка, несвядомага, непісьменнага, абяздоленага, тыя, хто жыў яго працай і каму проціпаставіў сябе Кастусь Каліноўскі, свядомы чалавек, каб бараніць пакрыўджанага сабрата.*

*Шчодрасць і цяпло сваёй душы паэт назаўсёды пакінуў удзячным чытачам. У вершы-прысвячэнні “Куляшову” Пімен Панчанка ўзрушана пісаў:*

Пад сонцам
І пад небам перуновым
Цяжэй нам без цябе пісаць і
жыць.
І кружыцца планета Куляшова,
І песня пра Алесю ўсё звініць.

# *4 лютага 1978г. Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў заўчасна памёр.*

**_ЭЛЕГІЯ_**

**Жыццё маё — цяжкі з гадамі бой,
І чым далей, то ўсё даўжэй прывалы,
Буксуюць вершы, быццам самазвалы,
Ды знаю я: надыдзе момант той,
Калі не хвоі снамі баравымі
Атуляць мой дарожны неспакой,
А схіляцца зларадна нада мной
Мае гады з бародамі даўгімі.
Чаго прыйшлі, за цудамі якімі?
Якога мне яны жадаюць сну?
Яшчэ я ўстану, падапруся кіем,
Старэчыя бароды расхіну.
За ўсе гады вазьму з гадоў даніну,
З дарогай разлічуся рэштай дзён,
Астатнія, як костку, смерці кіну
За той парог, дзе векавечны сон.**

**1961г.**